**УДК 348.84.038(476.5)**

# ПРАТЭСТАНТЫЗМ У ПОЛАЦКІМ ВАЯВОДСТВЕ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVI – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVII СТАГОДДЗЯ

***В.У. ЯКУБАЎ***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

*Артыкул прысвечаны праблемам існавання пратэстанцкіх супольнасцяў у Полацкім ваяводстве ў XVI – XVII стагоддзях. Паказаны асноўныя падзеі ў канфесіянальнай гісторыі, уплыў на развіццё мясцовых кальвінісцкіх і лютэранскіх збораў эканамічных і палітычных фактараў як на рэгіянальным, так і на міжнародным узроўні, раскрываюцца пытанні ўзаемаадносінаў паміж пратэстанцкай, праваслаўнай, каталіцкай, уніяцкай абшчынамі горада і ваяводства. Робіцца высновa аб значнай залежнасці полацкіх пратэстантаў ад знешніх фактараў: рыжскіх лютэран, маскоўскіх юдаізантаў, дзейнасці езуітаў і праваслаўных, дзяржаўнай знешняй і ўнутранай палітыкі, падтрымкі феадалаў.*

Гісторыя полацкай пратэстанцкай абшчыны (збору) вельмі слаба асветлена ў гістарыяграфіі. На сённяшні дзень вядомы толькі тры спецыяльныя артыкулы [1 – 3], а таксама працы аўтараў і ўзгадкі пра некаторыя моманты лакальнай гісторыі і асобаў мясцовых пратэстантаў. Галоўнай прычынай гэтага з’яўляецца амаль поўная адсутнасць першакрыніц, якія былі знішчаныя яшчэ ў XVI – XVII стагоддзях падчас войнаў і рэлігійных канфліктаў. Матэрыялы афіцыйнага справаводства па гісторыі пратэстанцкіх суполак азначанага перыяду і спрэчак вакол царкоўнай, мяшчанскай, шляхецкай маёмасці змяшчаюць комплекс “Літоўскай метрыкі” і Віленскі архіў пратэстанцкіх суполак [4].

Кантакты нямецкіх рэфарматараў з мяшчанамі і шляхтай на тэрыторыі Полацкага ваяводства, верагодна, пачаліся пасля замацавання свабоды для лютэранскага веравызнання ў Інфлянтах у 1524 годзе. Гэтаму бясспрэчна спрыялі традыцыйныя сувязі з Рыгай, на якой быў завязаны полацкі гандаль. Не выключана, што ў асяроддзі рыжан у Полацку і магла функцыянаваць нейкая пратэстанцкая суполка. Яна магла атрымаць нямецкі касцёл, які быў у горадзе згодна з ранейшымі міжнароднымі дамовамі пасля перамогі Рэфармацыі ў Інфлянтах. Дакументы па жыцці нямецкай грамады і касцёла (збору) у горадзе пакуль не ўведзены ў навуковае абарачэнне.

Разам з тым, акрамя заходняга накірунку, змены ў традыцыйны погляд на хрысціянства для праваслаўнай большасці полацкіх мяшчан прынеслі маскоўскія ўцекачы-“іўдаізанты”: Феадосій Касы, Арцемій і Фама. Яны заклікалі выкідваць з хат і цэркваў іконы, адмаўлялі святасць таямніц, манаскую аскезу і сцвярджалі, што царква замінае спасцігаць літасць Хрыста. Іх актыўнасць справакавала сутыкненні з праваслаўнай грамадой у Віцебску і іх перасяленне ўглыб Вялікага княства Літоўскага. У Полацку застаўся Фама, які ажаніўся на палачанцы і, магчыма, быў мясцовым пратэстанцкім святаром (міністрам) [1, с. 26].

У 1550-я гады, верагодна, быў заснаваны полацкі мяшчанскі збор, феадальнымі патронамі якога стала частка мясцовай шляхты. Згодна з інфармацыяй, якую падаюць маскоўскія крыніцы, праваслаўная большасць была варожа настроена да пратэстантаў. Летам 1562 года ў Полацку існавала пагроза антыпратэстанцкага пагрому з боку праваслаўных [5, с. 76]. Іван IV маскоўскі паход на горад у 1563 годзе ідэалагічна абгрунтоўваў уціскам праваслаўных з боку “бязбожнай Літвы і прыскверных Лютор” [6, с. 90]. Застаецца адкрытым пытанне аб рэальных адносінах праваслаўных да пратэстантаў, і хто былі гэтыя “люторы”: мясцовыя іншаверцы ў шырокім сэнсе, прыбалтыйскія лютэране, прыхільнікі маскоўскіх уцекачоў, ці гэты тэрмін калька тагачаснага польскага зняважлівага азначэння ератыкоў – “lotr”. Таксама праблемнай на сёння застаецца лакалізацыя і колькасць пратэстанцкіх збораў у Полацку. Вядома, што ў 30 – 60-я гады XVII стагоддзя мясцовы кальвінісцкі збор месціўся на вуліцы Вялікай у Запалоцці, побач з домам Стаброўскіх [3], але па другім звесткам, верагодна, – на месцы будучага касцёла Францішка Ксаверыя [7, с. 26], насупраць езуіцкага калегіума, каля рынку, мог быць малітоўны дом для рыжскіх лютэран.

Пасля захопу Полацка маскоўскімі войскамі ў 1563 годзе, паводле загаду цара Івана Жахлівага, Фаму-“іўдаізанта” патапілі ў Дзвіне. Горад стаў выключна праваслаўным. Ацалелыя мяшчане перанеслі збор у Дзісну. Падчас найбольшага пашырэння Рэфармацыі ў 1550 – 1570 гадах XVI стагоддзя ў ВКЛ склалася прэсвітарыянская, сінадальная мадэль арганізацыі евангеліцка-рэфармацкіх абшчын, у якую ўвайшлі Віленскае, Наваградскае, Брэсцкае, Рускае, Завілейскае, Жамойцкае суперінтэнданцтвы. Да Рускага суперінтэнданцтва адносіліся: Менск, Полацк, Орша, Віцебск, Мсціслаў [4, с. 24].

Пасля адваявання горада ВКЛ пратэстанты вярнуліся ў Полацк. Верагодна, у 1580 – 1590 гады галоўным патронам збору быў полацкі ваявода і, адпаведна, мясцовы войт Крыштоф Манівід Дарагастайскі (1576 – 1597), па фундацыі якога і быў адноўлены збор ужо ў 1579 годзе [8, с. 34]. У канцы XVI стагоддзя вялікая частка полацкай шляхты заставалася пратэстантамі (Стаброўскія, Дарагастайскія, Друцкія-

Саколінскія, Лукомскія, Цяпінскія, Корсакі), аднак у мяшчанскім асяроддзі пратэстанты перасталі быць значнай групай. Падчас наступлення контррэфармацыі пры Стэфане Баторыі (1576 – 1586) і Жыгімонце Вазе (1588 – 1632) пачынаюцца спробы стварэння абарончага саюза некаталіцкіх канфесій (разнаверцаў). Палітычнаму аб'яднанню пратэстантаў і праваслаўных садзейнічалі злоўжыванні мясцовых улад і канфлікты за былую царкоўную маёмасць.

Полацкія ваяводы К. Манівід Дарагастайскі і Андрэй Паўлавіч Сапега (1597 – 1613) жылі пераважна ў Кракаве і Вільні, а ўрад перадавалі ў субарэнду. Асабліва непапулярным сярод мяшчан стаў А.П. Сапега, які мала таго, што перадаваў пасаду ў трыманне Паўлу Сапезе і Даніэлю Шчыту Забельскаму (вядомых сваімі эканамічнымі злоўжываннямі супраць полацкіх і віленскіх мяшчан), але апантана імкнуўся пашырыць каталіцтва ў горадзе [9, с. 226 – 227; 10, с. 169 – 226].

З самага пачатку свайго кіравання ў ваяводстве ён увайшоў у канфлікт з мясцовай элітай, калі склаў пратэст супраць інструкцыі полацкага перадсоймавага з'езда 27 студзеня 1598 года і прызначэння двух пратэстантаў пасламі ад ваяводства. Паслы павінны былі "стаяць намёртва да перамогі" ў абароне правоў праваслаўных дызунітаў, пратэстантаў і аўтаноміі касцёла ВКЛ ад Польшчы, а А.П. Сапега быў абвінавачаны ў прысваенні фальваркаў (Чарсвяты і Курылавічы), якія належылі полацкаму замку [11]. Гэты канфлікт дасягнуў сваёй вяршыні вясной 1599 года, калі слугі ваяводы паспрабавалі прымусіць мяшчан замыкаць свае крамы ў каталіцкія святы [12, с. 173]. Пачаліся хваляванні, раззлаваныя мяшчане пагражалі спаліць замак, горад, касцёл св. Стэфана і езуіцкі калегіум, а самі перасяліцца да маскоўскіх аднаверцаў [13, с. 221 – 222]. У гэтым змаганні мяшчане выйгралі. Ужо з 1600 года А.П. Сапега вымушаны быў шукаць пакупніка на пасаду, а калі ў 1609 годзе ваявода наведаў Полацк, ізноў пачаліся хваляванні, і ён мусіў выехаць з горада. Прадаць пасаду ўдалося толькі ў 1613 годзе.

Неабходна адзначыць, што канфлікт пратэстанцкага і праваслаўнага насельніцтва Полацка з каталікамі меў глыбокія эканамічныя падставы. Паводле ўніверсала 22 студзеня 1582 года, Стэфан Баторый перадаў 322 вымарачных і царкоўных (Полацкага архіепіскапства) зямельных надзелаў у горадзе і наваколлі езуітам [14, с. 165]. Акрамя традыцыйна дамінуючай праваслаўнай большасці ў Полацку, на манаполію якой пачалося рэальнае наступленне, у разгледжаны перыяд змяншалася і колькасць пратэстанцкіх двароў, якіх паводле запісаў сінодаў 1636 і 1643 гадоў у горадзе было каля 15 [2, с. 26].

На сённяшні дзень не захавалася дастаткова крыніц, прысвечаных правядзенню Рэфармацыі ў шляхецкіх маёнтках і горадзе напярэдадні і падчас Інфлянцкіх войнаў 1558 – 1582 гадоў і пераходу царкоўнай маёмасці ў прыватныя рукі. Мяшчане імкнуліся захапіць землі, якія перайшлі ва ўласнасць езуітаў у 1582 годзе; многія з іх на момант выдачы каралеўскага ўніверсала на стварэнне калегіума жылі на іх. Шляхта праводзіла судовыя спрэчкі і іншымі метадамі змагалася за маёнткі з езуітамі і каталіцкім клірам. Кнігі судовых запісаў Метрыкі ВКЛ канца XVI – XVII стагоддзяў змяшчаюць вялікую колькасць дакументаў, прысвечаных маёмасным канфліктам паміж мясцовым насельніцтвам і езуітамі. Толькі за 1605 год [15, с. 41] езуіты судзіліся з полацкімі зямянамі Янам Нарушэвічам, Аляксандрам і Філонам Сцяпанавічамі Казачонкамі [15, с. 51], з Янам Варлехоўскім за валоданне пашай полацкага Машонцкага манастыра каля р. Дзісна, а ў верасні 1606 года – з кухмістрам ВКЛ Мікалаем Сапегам за маёмасць вакол Наўліцкага возера, якая раней належала Спаскаму манастыру. Шэраг уладанняў, і не толькі зямельных, у Полацкага архіепіскапства, спасылаючыся на прывілеі ранейшых гаспадароў, адсудзіла віленская капітула. Так, у 1608 годзе адбыўся шэраг судовых спраў паміж шляхтай, мяшчанамі і нават полацкім уніяцкім архіепіскапам Г. Бральніцкім за права шынкаваць гарэлку ў кутнай карчме ў Віцебску [16, с. 113 – 119].

Акрамя езуітаў-католікаў значныя канфлікты былі паміж насельніцтвам і ўніяцкім клірам. Перададзеная ўніятам частка ўласнасці полацкага архіепіскапства змяніла гаспадароў пасля Інфлянцкай вайны, а з іншага боку, сам працэс увядзення Берасцейскай уніі стварыў праблемы з легітымнасцю кіраўніцтва грэка-каталіцкай царквы, што ў сваю чаргу дазваляла насельніцтву шукаць магчымасці адмаўляцца ад выканання царкоўных абрадаў і феадальных павіннасцяў на яго карысць.

Найбольш моцныя канфлікты ўзніклі з пратэстанцкай часткай шляхты, якая захапіла пасля вайны царкоўную маёмасць і не жадала яе вяртаць. Нават спробы цэнтральных улад атрымаць адэкватную ацэнку маёмасці, сутыкнуліся са значным супраціўленнем. Спаслаўшыся на загад свайго пана, слугі М. Моніда Дарагастайскага з узброенымі полацкімі казакамі на чале з Станіславам Бароўскім, 1 – 13 студзеня 1588 года не дапусцілі каралеўскага камісара Ф.І. Гадзецкага зрабіць люстрацыю маёмасці полацкага ўладыкі [17]. У 1597 годзе полацкі ўніяцкі мітрапаліт Г. Загорскі паспрабаваў адсудзіць маёнткі полацкага Барысаглебскага манастыра, якія (верагодна, пасля вайны) былі заняты Корсакамі, Саламярэцкімі і Жыжкевічамі і іх жонкамі-сёстрамі, народжанымі Корсакамі, аднак развязка канфлікта наступіла толькі ў 1619 годзе [18]. Дзейнасць па вяртанні маёмасці ўніятам і прымушэнне да пераходу праваслаўных у грэка-каталіцтва з боку І. Кунцэвіча справакавала выступленні супраць яго ў Полацку, Магілёве і затым яго забойства ў Віцебску [19, с. 111 – 113].

Паводле падлікаў М. Ледке, у гэты перыяд прыкладна пяць прадстаўнікоў роду Корсакаў былі кальвіністамі [20, с. 119 – 120]. Яны былі багацейшымі феадаламі ваяводства і адным з найбольш шматлікіх, але непаслядоўных пратэстанцкіх родаў ВКЛ. Найбольш уплывовым прадстаўніком дому ў гэты час з'яўляўся Юры Корсак, які займаў сенатарскія пасады кашталяна менскага, затым полацкага (1597 – 1618), ён жа стаў правізарам евангеліцкага сінода ў 1597 годзе [21, с. 253].

У 1600 годзе Г. Загорскі пры абароне слугі, абвінавачанага за разбой у Полацку, выкарыстоўваў сваіх татар-мусульман, якія забілі аднаго з вязенных слуг і схавалі злачынца. Уніяты А. Корсак Галубіцкі і Д. Корсак і "іншыя хрэсціяне" папрасілі І. Пацея прыехаць у Полацк не толькі з-за таго, што Г. Загорскі "паганцаў пры царкве Божай хавае", але і з-за таго, што па яго бяздзейнасці "замак і могілкі побач з царквой не раз крывёй памазаны" [22, с. 9]. Магчыма, што эмацыянальнасць ліста тлумачыцца ўплывам эканамічнага канфлікту паміж уніяцкім архіепіскапам і мацнейшым феадальным родам ваяводства – Корсакамі.

У снежні 1605 года Г. Бральніцкі адсудзіў вёску Парогі Мікольскія, што раней належала сабору св. Сафіі, якую скарбны ВКЛ і дзісенскі стараста Лукаш Мамоніч захапіў сабе ў 1579 годзе [15]. Цікава, што ў судовых справах фігуруе тлумачэнне ад шляхты, што ў 1579 годзе С. Баторый дазволіў пры вызваленні Полацкага ваяводства ад маскоўцаў феадалам, якія прыйдуць змагацца, атрымаць тое, што тыя захопяць сваімі сіламі. Аднак гэтае абяцанне, відаць, не было запісана і пры разглядзе справаў на падставе апытання камісарамі мясцовых жыхароў, агучвання прывілеяў і попісаў маёмасці сабора св. Сафіі была даведзена прыналежнасць вёсак да ўладыцтва [15].

Духоўнае жыццё пратэстантаў у Полацку гэтага часу не вылучалася багаццем. Мясцовыя пратэстанты не маглі прыраўняцца да езуітаў, якія жылі ў горадзе, сярод якіх трэба адзначыць першага рэктара Полацкага калегіума, каралеўскага казначэя П. Скаргу і аднаго з лепшых навалацінскіх паэтаў і прамоўцу эпохі П. Сарбеўскага. Пратэстанты праводзілі публічныя дыспуты з езуітамі, прыцягваючы на дапамогу прадстаўнікоў з іншых гарадоў. Найбольш вядомы быў дыспут 1589 года паміж полацкімі езуітамі і кальвіністамі (або антытрынітарыямі) С. Будным і Ф. Даманеўскім. Навучанне ў езуіцкім калегіуме ўключала ўдзел у дыспутах з разнаверцамі, а калі яны не з'яўляліся на спрэчку, іх аргументы агучвалі самі настаўнікі, аднак пасля гэтага значных публічных дыспутаў паміж пратэстантамі і каталікамі ў Полацку не фіксавалася.

Слабасць пратэстанцкага мяшчанства горада ў некаторай ступені кампенсавалася іх палітычнай актыўнасцю, саюзам з праваслаўнымі і наяўнасцю вялікай колькасці кальвіністаў сярод шляхты. Наяўнасць саюза разнаверцаў не дазваляе размяжоўваць ініцыятывы і дзеянні праваслаўных і пратэстантаў. Для вырашэння сваіх праблем палачане як грамада без увагі на розніцы ў веравызнанні ўступалі ў хаўрусныя адносіны паміж сабой і з мяшчанамі іншых гарадоў. Так, у лістападзе 1605 года віленскія і полацкія мяшчане паспрабавалі дамагчыся трыбунальскага суда над кіеўскім уніяцкім мітрапалітам І. Пацеем.

Эканамічныя і палітычныя канфлікты розных грамадскіх слаёў з прадстаўнікамі свецкай і царкоўнай улады зрабілі Полацкае ваяводства адным з найбольш апазіцыйных да Жыгімонта Вазы падчас рокашу Я. Радзівіла – М. Зэбжыдоўскага ў ВКЛ 1606 – 1608 гадоў. Ахова інтарэсаў разнаверцаў была адной з галоўных задач полацкага пасла на сойм 1606 года, парнаўскага кашталяна П. Стаброўскага (у 1599 годзе ён быў правізарам сінода ВКЛ [21, с. 259]), аднаго з найбольш яркіх аратараў і соймавых дзеячоў падчас рокашу 1606 – 1608 гадоў. Пад яго ўплывам на рэляцыйным сойміку 16 мая 1606 года шляхта выступіла на баку ракашан і выслала двух паслоў на Люблінскі ракашовы сойм (Язэпа Есьмана і Фрыдрыха Неміровіча Шчыта). Інструкцыя паслам была падпісана 30 шляхціцамі, пераважна некаталікамі [23]. На грамнічным з'ездзе 2 лютага 1607 года 40 полацкіх шляхцічаў, галоўным чынам кальвіністаў і праваслаўных, звярнулася з падзякай за барацьбу за іх свабоду да маршалка рокашу Я. Радзівіла. На сойміку 19 сакавіка 1607 года справа дайшла да падзелу ўдзельнікаў. Адна частка запатрабавала завяршэння рокашу і прызначыла на з'езд пад Енджэювам пасламі П. Стаброўскага, Д. Корсака і П. Каніньскага, якім было загадана дамагацца ўраўнавання вісліцкіх (рэгалісцкіх) і сандамірскіх (ракашовых) артыкулаў, пазбаўлення Віленскага праваслаўнага брацтва ад усялякага прыцяснення, прасіць караля аб зацвярджэнні полацкага ўладыкі, якога павінна была абіраць сама полацкая шляхта, і абароне ўласнасці архіепіскапства падчас вакансіі [24; 25]. Кароль паабяцаў задаволіць шмат з патрабаванняў разнаверцаў, а сойм 1607 года заклікаў мясцовае насельніцтва да адбудовы св. Сафіі, пашкоджанай яшчэ падчас Інфлянцкіх войнаў 1559 – 1582 гадоў, у якой павінны былі не толькі спраўляцца рэлігійныя абрады, але і захоўвацца мяшчанская і шляхецкая дакументацыя [26].

Паражэнне ракашан не змяніла асноўных патрабаванняў полацкай шляхты ў канфесійнай сферы: полацкая інструкцыя на сойм 1611 года патрабавала ад свайго пасла П. Стаброўскага настойваць на выкананні канстытуцыі 1609 года "аб рэлігіі грэцкай" і пакаранні ўдзельнікаў віленскага тумульту 1609 года (пагрому і спалення каталікамі мясцовага збору), падтрымаць віленскіх мяшчан у іх змаганні з І. Пацеем, прасіць выпусціць з вязніцы пісара Віленскага брацтва Л. Карповіча і спыніць ўсялякія ўніяцкія "інквізіцыі"

(злоўжыванні) у дачыненні да праваслаўных. Дакумент падпісалі кальвіністы П. Стаброўскі, Міхал Друцкі-Сакалінскі, Фрыдрых Лукомскі і ўніят А. Корсак-Галубіцкі [8, с. 267; 27, с. 89].

Арышт, накладзены на маёмасць П. Стаброўскага пасля рокашу, захоўваў моц да 1618 года, тым не менш ён працягваў актыўна ўдзельнічаць не толькі ў палітычным, але і царкоўным жыцці. Паводле яго прапановы, з сялян у маёнтках пратэстанцкай шляхты ў 1611 годзе быў уведзены падатак у 6 грошаў на сінод. На сінодзе 1615 года ў маёнтках евангеліцкай шляхты прапанавалася забараніць будаваць новыя і дабудоўваць старыя цэрквы, там дзе іх раней не было [4, с. 29]. "Для разбудовы царквы", збліжэнні з насельніцтвам сінод дазволіў у Рускім дыстрыкце пры святкаванні святаў у 1616 годзе адзначаць іх па старым (юліянскім) і па новым (грыгарыянскім) календары [4, с. 38].

Актыўнымі прадстаўнікамі полацкай кальвіністкай шляхты з сярэдзіны XVI стагоддзя сталі Франкевічы Радзімінськія. Справу падтрымкі разнаверцаў на агульнадзяржаўным узроўні ў пачатку XVII стагоддзя працягваў Ян Франкевіч Радзімінські, які ў 1623 годзе перадаў віленскаму збору на наём пяхоты 50 злотых [4, с. 83], а ў 1624 годзе ён быў абраны дырэктарам сінода [4, с. 91]. Аднак увогуле маёмаснае становішча полацкіх пратэстантаў было кепскім, таму па рашэнні віленскага сінода на патрэбы полацкага збору ў 1621 годзе П. Стаброўскаму са скрынкі сінода было выдадзена 20 коп грошай [4, с. 65], а ў 1622 годе ў рукі сеньёра полацкага збору Марціна Прылюбскага – 300 злотых ад Паўла Маслоўскага. У тым жа 1622 годзе да палачан быў дасланы міністр Сімон Серуаціўс, які павінны быў таксама па дамоўленасці з мясцовым зборам ездзіць да Глыбокага [4, с. 70]. У 1632 годзе полацкі сеньёр Крыштоф Гарайскі папрасіў сінод аб запрашэнні новага прапаведніка; у 1634 годзе будынак збору быў знішчаны падчас вайны супраць Маскоўскай дзяржавы 1632 – 1634 гадоў. Але ўжо ў 1634 годзе збор падтрымала жонка Яна Пуцяты, і ў 1636 годзе тут зноў з'явіўся сталы прапаведнік – Мусоніюш. Ён засведчыў тагачасную сітуацыю – збор знаходзіцца ў заняпадзе з-за "непрыяцеля маскавіціна і адсутнасці падтрымкі збоку паноў-патронаў" [21, с. 219].

Полацкая шляхта ў 1632 годзе папрасіла вальны сойм дазволіць будаваць рознаверчыя, у тым ліку пратэстанцкія, зборы на старых месцах у гарадах і маёнтках шляхты. Аднак напруга паміж канфесіямі засталася. Значным скандалам ва ўнутрыпалітычным жыцці ўсёй Рэчы Паспалітай стала знішчэнне ў ноч з 23 на 24 ліпеня 1638 года, натоўпам якім кіравалі вучні езуітаў – маладыя Корсакі, кальвіністкага збору ў Полацку. Кароль Уладыслаў Ваза запатрабаваў ад мясцовага ваяводы Януша Кішкі і гарадскіх улад схапіць і пакараць вінаватых і прасачыць за выкараненнем усялякага ўціску над дысідэнтамі ў іх набажэнстве [8, с. 464]. На думку В. Галубовіча, да манарха інфармацыя пра падзеі, хутчэй за ўсё, трапіла дзякуючы падтрымцы біржанскіх Радзівілаў. Але відавочна і тое, што сам Уладзіслаў на жадаў пэцкаць рукі ў гэтай справе і "абачліва" даручыў яе Янушу Кішке. Ведаючы меланхалічны характар полацкага ваяводы, які не быў асобай публічнай і досыць слаба кантраляваў падначаленае яму ваяводства, можна не сумнявацца, што каралеўскае распараджэнне, калі і было выканана, то з мінімальнымі наступствамі для злачынцаў. Рэалізацыя прысуду не пераўтварылася ў гучную справу і ў Вялікім княстве Літоўскім вялікага розгаласу з нагоды пакарання не было. Гэта можна сцвярджаць ужо па тым, што ні ў Радзівілаўскім, ні ў Кішкаўскім архівах, ні ў захаваных полацкіх дакументах працягу справы знайсці не ўдалося [28, с. 67].

Слабасць мясцовай пратэстанцкай абшчыны прывяла да таго, што ў 1650 годзе полацкія езуіты паспрабавалі захапіць маёмасць збору, што прывяло да іх судовага супрацьстаяння з лідскім маршалкам Раецкім. Найбольш важным апекуном пратэстантаў ВКЛ у гэты час становіцца вялікі гетман Януш Радзівіл, якому сінод даручыў асаблівую апеку над полацкім зборам [21, с. 219]. Аднак на 1669 год некаторыя мяшчане, якія раней былі залежнымі ад збору, усё ж патрапілі пад уладу езуітаў [3, с. 68].

Па падліках В. Красіньскага, у Полацкім ваяводстве ў разгледжаны перыяд налічвалася 5 кальвіністкіх збораў, віцебскім – 7, мсціслаўскім – 2, у мінскім – 11, з якіх толькі па два ў Менскім і Полацкім ваяводстве пратрывала да вайны 1654 – 1667 гадоў [21, с. 140]. Найбольш значнымі цэнтрамі пратэстантызму ў ваяводстве, акрамя Полацка, былі Глыбокае, Беразвечча, Княжыца і Цяпіна. Усе яны ўтрымліваліся за кошт феадальных патронаў – Васіль Цяпінскі на ўласныя сродкі заснаваў друкарню і збор у Цяпіна пад Лепелем, берасцейскі ваявода Крыштоф Зяновіч фундаваў кальвіністкі збор у Глыбокім да 1616 года [21, с. 210], адзін з Прылюбскіх у 1622 годзе запісаў на полацкі збор 300 злотых, а другі з прадстаўнікоў гэтага роду папрасіў сінод аб прысылцы прапаведніка ў Беразвечча ў 1629 годзе [21, с. 208]. У першай палове XVII стагоддзя Юры Зяновіч заснаваў у Глыбокім кальвіністкі збор, а пры ім школу. Заняпад пратэстанцкай абшчыны ў Глыбокім варта адносіць да пачатку XVII стагоддзя, калі Міхал Зяновіч змяніў сваю канфесію з пратэстанцкай на каталіцкую і заснаваў у мястэчку касцёл св. Міхала [29, с. 11].

Полацкі збор не займаў лідэрскай пазіцыі ў Рускім суперінтэндантстве не толькі з пункту гледжання маёмасці і багатых патронаў, але і па ўдаласці кар'ер яго прадстаўнікоў у ВКЛ. Рускія суперінтэнданты, прынамсі ў другім дзесяцігоддзі XVII стагоддзя, не былі звязаныя з Полацкам: Марцін Цертуліян Белянскі (1614 – 1616) кансультаваўся з аршанскім судзей Варапаем, Федар Здановіч (1619 – 1620) быў казнадзеям у Оршы [4, с. 40], Ян Тамашэвіч (1621 – 1623) – рабіў казанні ў Менску, затым у Копысі [4, с. 126].

Хутчэй за ўсё першынство ў суперінтэнданцтве па эканамічных і палітычных матывах знаходзілася ў Менскага збору, які пры падтрымцы Радзівілаў і іншых патронаў-феадалаў праіснаваў да пачатку XIX стагоддзя [21, с. 140]. Так, у 1623 годзе было прынята рашэнне аб тым, што ў Менскім зборы былі ўведзены ахоўнікі-“пастаянныя мешканцы”, паколькі падчас Трыбунала ВКЛ у гэты горад прыязджаюць шматлікія вернікі розных канфесій і, адпаведна, трэба сачыць за памяшканнем і будынкам. Віцебскія зборы з 1570-х па 1680-я гады падтрымлівалі Саламярэцкія і Храпавіцкія [21, с. 226], мсціслаўскія – М. Нарушэвіч [21, с. 255] і Галоўчынскія [21, с. 251]. Разбурэнні і дэпартацыі насельніцтва падчас войнаў 1654 – 1667 гадоў прывялі да спынення існавання полацкага пратэстанцкага збору. Частка полацкіх пратэстантаў перасялілася ў Якабпілс, і з іх асяродку, верагодна, паходзіла Марта Скаўронская (расійская імператрыца Кацярына I). У самім горадзе пратэстантызм працягвалі спавядаць немцы, на грошы якіх у XIX стагоддзі была збудавана лютэранская кірха на вул. Ніжняй Пакроўскай.

**Заключэнне.** Стварэнне пратэстанцкай абшчыны ў Полацку знаходзілася пад моцным уплывам знешніх фактараў. Карані яе ўзнікнення знаходзяцца ў кантактах полацкіх мяшчан з прыбалтыйскімі лютэранамі і маскоўскімі “іўдаізантамі” ў сярэдзіне XVI стагоддзя. У 1563 – 1579 гадах падчас маскоўскай акупацыі дзейнасць пратэстантаў у горадзе была пад забаронай. Пасляваеннае аднаўленне пратэстанцкай абшчыны звязана падтрымкай значнай часткі шляхты (Манівід Дарагастайскія, Стаброўскія, Корсакі, Талвашы і інш.). На гэтым этапе асноўнай плынню ў межах пратэстантызму становіцца кальвінізм. З канца XVI стагоддзя да 1630-х гадоў дзейнічаў палітычны саюз паміж пратэстантамі і праваслаўнымі ва ўмовах падтрымкі афіцыйнымі ўладамі Рэчы Паспалітай контррэфармацыйнага руху. Пратэстанцка-праваслаўны саюз моцна ўплываў на выпрацоўку мясцовай шляхтай рашэнняў на сойміках, у якіх адлюстроўваліся інтарэсы некатолікаў і патрабавалася талерантнае стаўленне ад улад да пратэстантаў. Да сярэдзіны XVII стагоддзя адбываецца працэс паступовага пераходу прадстаўнікоў пратэстанцкай шляхты ў каталіцызм. Страта пратэстанцкай абшчынай палітычнай і эканамічнай апекі ад феадалаў, а таксама наступствы “тумульту” 1638 года і ваенныя разбурэнні 1632 – 1634 і 1654 – 1667 гадоў прывялі да істотнага змяншэння ўплыву пратэстанцкіх канфесій ў рэгіёне.

ЛІТАРАТУРА

1. Иванова, Л.С. Из истории реформационной церкви в Полоцке (вторая половина XVI – первая половина XVII в.) / Л.С. Иванова // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі: матэрыялы навук. канф.; склад. Т.А. Джумантаева. – Полацк, 1992. – С. 25 – 27.
2. Говорский, К. О введении, распространении и судьбе кальвинизма в Белоруссии / К. Говорский // Вестн. Западной России. Год 2. Т. 4. – 1864, февраль. – Отд. 2. – С. 19 – 21.
3. Дзярновіч, А. Гарадская сядзіба Полацка XVII ст. (паводле інвентара з Радзівілаўскага архіва) / А. Дзярновіч // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі: матэрыялы V міжнар. навук. канф., Полацк, 24 – 25 кастр. 2007 г. – Полацк: НПГКМЗ, 2009. – С. 65 – 75.
4. Zbiór Pomników Reformacji koscioła polskiego i litewskiego / Serja IV, Zeszyt II: Akta Synodów prowincjalnych jednoty Litewskiej 1611 – 1625. – Wilno, Warszawa: Druk. Ginsa, 1915. – 136 s.
5. Янушкевіч, А. Загадкі выправы Івана Грознага на Полацк / А. Янушкевіч // Архэ. Пачатак. – 2009. – № 4. – S. 76.
6. Александров, Д.Н. Борьба за Полоцк между Литвой и Русью в XII – XVI веках / Д.Н. Александров, Д.М. Володихин. – М.: Изд. предприятие «Аванта+», 1994. – 134 с.
7. Дук, Д. Сацыятапаграфічная структура і забудова Полацка ў XVI – XVII стст. / Д. Дук // Архэ. Пачатак. – 2010. – № 3. – С. 7 – 61.
8. Kempa, T. Wobec kontrreformacji. Protestanci i prawosławni w obronie swobód wyznaniowych w Rzeczypospolitej w końcu XVI i w pierwszej połowie XVII wieku / T. Kempa. – Toruń: Wydawnictwo Adam Marszałek, 2007. – 624 s.
9. Витебская старина: в 5 т. / сост. и изд. А. Сапунов. – Витебск: Витебский губернский статист. комитет, 1883 – 1888. – Т. 5, ч. 1: Материалы для истории Полоцкой епархии. – 1888. – 650 с.
10. Inglot, S. Sprawy gospodarcze Lwa Sapehy / S. Inglot // Studia z Historii spółecznej i gospodarczej, poświęconych profesorowi dr. Fr. Bujakowi. – Lwów: Naklad Wydawnictwa Polskiego, 1939. – S. 169 – 226.
11. Бібліятэка-архіў Чартарыйскіх (BCz). – Rkps. 2234. sygn. 51. Instrukcja Połocka na zjazd Słonimski (1598 r.).
12. Sapieha, E. Dom Sapieżyński / E. Sapieha, J. Tazbir. – Warszawa: Wydawnictwo naukowe PWN, 1995. – 805 s.
13. Archiwum domu Sapiechów / wyd. A. Prochaska. – Lwów: Drukarnia zakładu narodowego imeni Ossolińskich, 1892. – T. 1: (Listy z lat 1575 – 1606). – S. 221 – 222.
14. Памяць: гіст.-дакум. хроніка Полацка / рэд. кал.: Г.П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 2002.
15. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – КМФ 18. – Спр. 291. Кніга запісаў метрыкі ВКЛ.

16. НГАБ. – КМФ 18. – Спр. 292. Кніга запісаў метрыкі ВКЛ.
17. 1588 декабря 13. Увязчій (вводный) ліст дворянина Годебскаго епископу Полацкаму Афонасию Терлецкому на владения архиепископии с инвентарём // Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси. – Вильна, 1867. – Т. 1. – С. 167 – 174 [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://pbc.biaman.pl/dlibra/doccontent2?id=560&dirids=1//date 4.10.2009.
18. Вернікоўская, А. Супраціўленне праваслаўных Полацкай епархіі ўвядзенню уніі і забойства Язафата Кунцэвіча // Беларускі гістарычны агляд, Снежань 2001. – Т. 8. Сшытак 1 – 2 (14 – 15) [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.lingvo.minsk.by/~bha/08/bha08idx.htm// date 4.10.2009.
19. Жукович, П.Н. Сеймовая борьба православного западно-русского дворянства с церковной унией с 1609 г. / П.Н. Жукович. – СПб.: Тип. главного управления уделов, 1904. – Т. 2. – 121 с.
20. Ledke, M. Od prawosławia do katoliczymu. Ruscy możni i szlahta Wielkiego Księstwa Lietewskiego wobiec wzynań reformacyjnych / M. Ledke. – Białostock: Wydawnictwo uniwersztetu Białostockiego, 2004. – 313 s.
21. Krasiński, W. Zarys dziejów powstania i reformacji w Polsce / W. Krasiński. – Warszawa: Zwiastun Ewangeliczny, 1905. – T. 2, cz. 2. – 274 s.
22. Kempa, T. Prawosławie i unia we wschodnich województwach WKL w końcu XVI i pierwszej połowie XVII w. / T. Kempa // Białoruskie zeszyty historyczne Białystok. – 2004. – T. 22. – S. 5 – 41.
23. Архіў Галоўны актаў Даўніх (AGAD). – AR. – Dz. II. – Sygn. 450. Instrukcja szlachty Połockiej na zjazd Lubelski od 16. V. 1606 г. Połock.
24. AGAD. – AR. – Dz. II. – Sygn. 510. Інструкцыя шляхты Полацкага павета ад 19.03.1607 г.
25. Wisner, H. Litwa wobiec rokoszu (1606 – 1607) / H. Wisner // Kwartalnik Historysczny. – Warszawa, 1972. – T. 1. – S. 294.
26. Volumina legum: w 9 t. / nakladem i drukiem Jozofata Ohryzki. – St. Petersburg: przedruk zbioru praw staraniem xx. pijarow w Warszawe, od roku 1732 do roku 1782, wydanego, Drukarnia J. Ohryzki, 1859. – T. II: Ab anno 1550 ad annum 1609. – 450 s.
27. Мірановіч, А. Праваслаўная Беларусь / А. Мірановіч. – Беласток: Offset Print, 2009. – 352 s.
28. Міжканфесійныя адносіны ў Полацкім ваяводстве (другая палова XVI – першая палова XVII стст.): справаздача па НДР (заключ.) / Полацкі дзярж. ун-т; кір. тэмы І.А. Бортнік. – Наваполацк, 2011. – 92 с. – № Г09ПЛ-003 от 01.04.2009 г.
29. Hedemann, O. Głębokie / O. Hedemann. – Wilno: Oddział Polskiego Towarzystwa krajoznawczego w Głębokiem, 1935. – 58 s.

*Пастуліў 26.11.2011*

**PROTESTANTISM IN POLOTSK VOIVODESHIP**
**THE SECOND HALF OF XVI – THE FIRST HALF OF XVII CENTURIES**

***V. YAKUBAU***

*This paper deals with problems of the existence of Protestant communities in the Polotsk Voivodeship, in XVI – XVII century. Are the major events in religious history, impact on thelocal Calvinist and Lutheran charges of economic and political factors at both the regional and international levels, presents issues relaton between Protestant, Orthodox, Catholic, Unitarian communities of city and province. It is concluded that a significant dependence of the Protestants of Polotsk on external factors: Riga Lutheran, Moscow Judaizant heretics, activities of the Jesuits and the Orthodox, the state's foreign and domestic policies, support for the feudal lords.*